Дэманстрацыйны варыянт
рэспубліканскай кантрольнай работы
па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»
(*X клас*; 2024/2025 навучальны год)

**Заданне 1**. **Адзначце два словы, у якіх націск пастаўлены правільна.** *Запішыце ў «Бланк адказаў» нумары правільных адказаў (напрыклад: 2, 5).*

1) дакуме́нт;
2) э́ксперт;
3) грамадзя́нін;
4) ста́ры;
5) наві́на.

**Заданне 2. Працягніце сцверджанні.** *Запішыце сцверджанні ў «Бланк адказаў».*

1) Лаканічнасць (сцісласць) маўлення – гэта ... .
2) Арфаэпічныя нормы – гэта нормы літаратурнай мовы, якія вызначаюць ... .

**Заданні 3–5.**
**Прачытайце тэкст і выканайце заданні 3–5.**

Ваенны парад 3 ліпеня 2024 года

Рэспубліка Беларусь 3 ліпеня 2024 года адзначыла Дзень Незалежнасці і васьмідзесяцігадовы юбілей вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У гэты дзень у беларускай сталіцы прайшоў ваенны парад. Урачыстае праходжанне войск пачалося з вынасу Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь ваеннаслужачымі роты г__наровай варты. Затым адбыўся рытуал прыняцця парада, аб'езд войск міністрам абароны і нарэ__це сам парад.

У пешых разліках, упэўнена чаканячы крок, перад трыбунамі прайшлі курсанты, гвар__ейцы, дэсантнікі, пра__стаўнікі сілавых ведамстваў – усяго 36 парадных каробак, дзевяць з якіх пра__стаўлены ваеннаслужачымі з іншых дзяржаў.

Магутнасць пешых разлікаў дапоўнілі 29 парадных разлікаў механізаванай калоны. На праспект выехала звыш 300 адзінак гусенічнай і колавай ваеннай тэхнікі. Першымі ў калоне прайшлі рарытэты — сем легендарных танкаў «Т-34». Шырока на парадзе былі пра__стаўлены сучаснае ўзбраенне і тэхніка Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Беларусы і госці нашай краіны маглі пераканацца, што беларуская армія валодае ўсім неабходным, каб абараніць сваю краіну і, калі спатрэбіцца, нанесці праціўніку непрымальную шкоду. Высокі баявы патэнцыял і вышэйшы пілатаж прадэманстравалі лётчыкі. У небе над сталіцай прал__цела каля пяці дзясяткаў сучасных баявых машын ваеннай авіяцыі Саюзнай дзяржавы.

Па традыцыі завяршылася ваенная частка парада пляц-канцэртам зводнай роты г__наровай варты. Новыя элементы, падрыхтаваныя элітнымі падраздзяленнямі сілавых ведамстваў краіны, нікога не пакінулі абыякавымі.

А тэатралізаванае дзейства пад назвай «80 пераможных гадоў» расказала прысутным аб дасягненнях пасляваеннай і сучаснай Беларусі.

*Па матэрыялах газеты «Звязда».*

**Заданне 3. Устаўце ў словы з левага слупка на месцы падкрэсліванняў прапушчаныя літары.** *Адказ запішыце ў «Бланк адказаў».*

**Устанавіце адпаведнасць паміж левым і правым слупкамі табліцы.** *Адказ запішыце ў «Бланк адказаў» у выглядзе спалучэння літары і адпаведнай лічбы (напрыклад: А4Б2В3Г5Д6Е7). Літары павінны ісці ў алфавітным парадку.*

| **Арфаграфічныя нормы** | **Арфаэпічныя нормы** |
|---|---|
| А. г__наровы | 1) дзеканне; |
| Б. гвар__ейцы | 2) прыпадабненне шыпячага гука да свісцячага; |
| В. пра_стаўлены | 3) азванчэнне глухога гука перад звонкім; |
| Г. нарэ__це | 4) аглушэнне звонкага гука перад глухім; |
| Д. прал__цела | 5) аканне; |
| | 6) яканне |

**Заданне 4. Устанавіце адпаведнасць паміж левым і правым слупкамі табліцы. Выберыце, які з выразаў перадае тэму, які – асноўную думку, а які – падтэму тэксту.** *Адказ запішыце ў «Бланк адказаў» у выглядзе спалучэння літары і адпаведнай лічбы (напрыклад: А4Б2В3). Літары павінны ісці ў алфавітным парадку.*

**Вызначце, да якога стылю і тыпу належыць прыведзены тэкст.** *Адказ запішыце ў «Бланк адказаў» (напрыклад: навуковы стыль; апісанне).*

| | |
|---|---|
| А. Тэма тэксту – … | 1) Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. |
| Б. Асноўная думка тэксту – … | 2) Ваенны парад 3 ліпеня 2024 года. |
| В. Падтэма тэксту – … | 3) Беларуская армія валодае ўсім неабходным, каб абараніць сваю краіну. |
| | 4) Пляц-канцэрт зводнай роты г_наровай варты. |

**Заданне 5. Паразважайце, пра што сведчыць традыцыя праводзіць ваенны парад у Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.** *Складзіце і запішыце ў «Бланк адказаў» тэкст з 5–7 сказаў на гэту тэму (абгрунтуйце свой адказ, прывядзіце не менш як тры аргументы ў пацвярджэнне сваёй думкі).* **Дайце тэксту загаловак. Пры адказе выкарыстайце:**

- **просты сказ з адасобленай акалічнасцю;**
- **складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай часткай прычыны;**
- **бяззлучнікавы складаны сказ;**
- **сінонім да слова *армія.***